

НОВЫЯ ПАДРАБЯЗНАСЦІ СПРАВЫ АБ ГЕНАЦЫДЗЕ

ВЯДОМЫЯ БЕЛАРУСЫ – АБ ТЫМ, ЯК СУСТРАКАЛІ ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

8 мая 2024 г.
СЕРАДА
№ 90 (30224)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

С ДНЁМ ПЕРАМОГІ

# Нашы маральныя арыенціры

*Дарагія суайчыннікі!*

*Віншую вас з Днём Перамогі!*

*Гэтае свяшчэннае свята адгукаецца ў нашых сэрцах вялікай радасцю і бязмернай удзячнасцю савецкаму народу, які знішчыў фашызм і выратаваў будучыню чалавецтва цаной мільёнаў жыццяў.*

*У кожным кутку, кожнай сям'і Беларусі спароджаная нянавісцю і ідэямі сусветнага панавання вайна пакінула незагойныя раны ад жахлівых злачынстваў гітлераўскіх катаў і іх паслугачоў.*

*Гераічная барацьба з ворагам і самаадданая праца ў тыле сталі ўвасабленнем усенароднага супраціўлення і гатоўнасці беларусаў да самаахвяравання.*

*Адзінства нашых продкаў, іх любоў да Радзімы і шчырая вера ў перамогу назаўжды сталі маральнымі арыенцірамі для ўдзячных пакаленняў мірнай і незалежнай беларускай дзяржавы.*

*Праз гады праўда пра Вялікую Перамогу засцерагае нашу зямлю ад пагроз новага часу, а ўсё чалавецтва — ад адраджэння разбуральных ідэй нацызму.*

*Беларускі народ свята шануе памяць загінулых і ніколі не аддасць забыццю імёны бязвінных мучанікаў і славу мужных абаронцаў і вызваліцеляў.*

*Жадаю нашым дарагім ветэранам моцнага здароўя і даўгалецця, а таксама шчасця, міру і дабра ў кожны дом.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



**Ветэранаў, для якіх Вялікая Айчынная вайна — частка жыцця, а Дзень Перамогі — самы важны ў жыцці дзень, застаецца сярод нас усё менш. Тым каштоўнейшыя іх сведчанні, тым важней паглядзець ім у вочы.**

**Фёдару Сяргеевічу ФЕШЧАНКУ сёлета будзе 99 гадоў. Калі пачалася вайна, ён перайшоў у дзявяты клас. Але восенню 1941-га парту замяніў такарны станок — юнак пайшоў працаваць на абаронны завод на Урале. Давялося напоўніцу пакаштаваць і ваеннага хлеба. Пасля прызыву ў 1943-м асвоіў навуку артылерыста і ў складзе 3-га Беларускага фронту ўдзельнічаў у аперацыі «Баграціён». Лёс на ўсё жыццё звязаў яго з зямлёй, якую вызваляў. Тут атрымаў вышэйшую адукацыю, абараніў кандыдацкую дысертацыю, доўгі час працаваў у Інстытуце эканомікі НАН і ў БДУ...**

**Да сёння Фёдар Сяргеевіч захоўвае сваю кніжку чырвонаармейца — франтавы дакумент, атрыманы 80 гадоў таму.**

**Антону Сцяпанавічу ЗУБОЎСКАМУ, калі пачалася вайна, было пятнаццаць. Вайна застала яго ў Пухавіцкім раёне, у роднай вёсцы, дзе ён выжываў з сям'ёй пад акупацыяй. 14 ліпеня 1944-га быў прызваны ў Чырвоную Армію, перамогу сустракаў у Сілезіі камандзірам аддзялення стралковага ўзвода. Пасля вайны скончыў ваеннае авіяцыйнае інжынернае вучылішча ў Кіеве, пасля заканчэння ваеннай службы ў 1977 годзе вярнуўся на Радзіму. Мае званне палкоўніка. Простыя словы біяграфіі. Простыя немаладыя твары на фота. Менавіта дзякуючы вось такім простым людзям у нас ёсць вялікае свята — Дзень Перамогі. У нас ёсць жыццё і будучыня.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «ПРАЎДА АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ ФАШЫЗМУ СЛУЖЫЦЬ СУР'ЁЗНАЙ ПЕРАСЦЯРОГАЙ ЧАЛАВЕЦТВУ»

### Для беларусаў памяць аб вайне мацнейшая за час і не мае межаў




Фота БелТА.

**За апошнія 80 гадоў беларусы пераканаліся, што мір — самая вялікая каштоўнасць. У Дзень Перамогі важна не толькі успамінаць аб вайне, але і гаварыць аб міры. Успамінаць, якой цаной ён дастаўся нашым продкам, і аналізаваць, што трэба рабіць сучаснаму пакаленню, каб захаваць спакой. Менавіта такія пасылы сталі лейтматывам урачыстага сходу з нагоды Дня Перамогі, які прайшоў у Палацы Рэспублікі. Удзел ва ўрачыстым сходзе прыняў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў нашай гісторыі нямала яркіх старонак, якімі мы па праве ганарымся. Не ўсе з іх захавалі сваю значнасць да нашых дзён. Многія, страціўшы былыя сэнсы, аказаліся папросту забытыя. «Аднак ёсць даты і падзеі, якія нясуць у сабе разуменне сутнасці і праўду жыцця. Яны непадуладныя часу і абставінам, перадаюцца праз пакаленні з малаком маці, засцерагаюць ад памылак і дапамагаюць ствараць будучыню. Для беларусаў такой падзеяй стала Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне», — сказаў ён. Менавіта таму, па словах Прэзідэнта, у абноўленай Канстытуцыі замацаваны тэзіс аб тым, што «дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

### УСЕ НАРОДЫ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ, ЯКУЮ ЦАНУ ЗАПЛАЦІЛІ БЕЛАРУСЫ ЗА МІР І СВАБОДУ

«Для нас, беларусаў, праўда і памяць аб вайне мацнейшыя за час і не маюць межаў. Мы памятаем нашых сяброў-антыфашыстаў, герояў палка «Нармандыя –Нёман», удзельнікаў сустрэчы на Эльбе і іншыя прыклады сумеснай барацьбы з ворагам. Гэта прадмет нашага агульнага гонару з усімі, хто разам з намі супрацьстаяў фашызму. І хто яшчэ ганарыцца, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Усе народы зямлі павінны ведаць, якая неймаверна высокая цана была заплачана беларусамі за мір і свабоду». Беларускі лідар прывёў лічбы, над якімі заклікаў задумацца. Звыш 300 тысяч нашых суайчыннікаў былі сагнаны ў Германію ў якасці рабоў. Фактычна ўсё насельніцтва такой краіны, як Ісландыя, ці ўвесь даваенны Мінск. Толькі сумна вядомы лагер Трасцянец забраў жыцці больш за 200 тысяч мірных грамадзян.

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

## КОРАТКА

- **Дзяржмузеі 9 Мая можна будзе наведаць бясплатна.**
- Мемарыяльную пліту з імёнамі 60 воінаў РСЧА ўстанавілі на брацкай магіле ў Аршанскім раёне.
- **Беларуская цэментная кампанія запусціла ўласны цягнік для дастаўкі цэменту ў Расію.**
- Золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 мая склалі $8,442 млрд.
- **Фізасобы ў Беларусі ў красавіку прадалі на $82,8 млн валюты больш, чым купілі.**
- У Беларусі за год плануюць пабудаваць 15 дзіцячых садкоў.